ЦЭНТР НОВЫХ ІДЭЙ



# БАРОМЕТР РЭПРЭСІЙ

*II КВАРТАЛ 2024 г.*

Генадзь Коршунаў

Цэнтр новых ідэй | Ліпень 2024

# РЭЗЮМЭ

Інфармацыя пра рэпрэсіўна-карныя захады ўладаў прыходзяць з Беларусі практычна кожны дзень. Гэта ўжо суцэльны паток, у якім без дэталёвага аналізу складана вызначаць галоўныя напрамкі і асаблівасці.

Каб разумець, як эвалюцыянуюць карныя практыкі рэжыму, якія тэндэнцыі ў рэпрэсіях згасаюць і якія новыя трэнды з’яўляюцца, раз на квартал Цэнтр новых ідэй будзе прэзентаваць справаздачу паводле даследавання “Барометр рэпрэсій у Беларусі”.

У нашым даследаванні асноўны фокус увагі скіраваны перадусім на статыстычныя, колькасныя звесткі. Дадзеная справаздача не ставіць сабе за мэту падмяніць дэталёвыя справаздачы праваабарончых арганізацый. У нас іншыя задачы аналітыка-статыстычнага кшталту: па-першае, акрэсліць абагуленую карціну працы рэпрэсіўна-карнай сістэмы рэжыму ў Беларусі; па-другое, вылучыць асаблівасці яе функцыянавання цягам пэўных часавых інтэрвалаў (кварталаў).

Падаецца, такое агрэгаванне асноўных колькасных паказнікаў (перадусім ад праваабаронцаў, але і з улікам афіцыйнай статыстыкі) пры дапамозе аналізу кантэкставай інфармацыі можа быць карысным для ўсіх, хто хоча разумець, што адбываецца ў Беларусі ў плашчыні ціску рэжыму на грамадства.

Аўтар даследавання – старшы даследчык Цэнтра новых ідэй, кандыдат сацыялагічных навук Генадзь Коршунаў.

Аўтар выказвае шчырую падзяку за працу беларускім праваабаронцам, асабліва тым, чые звесткі выкарыстоўваліся падчас падрыхтоўкі справаздачы. Гэта праваабарончы цэнтр “Вясна”, праваабарончыя арганізацыі ды ініцыятывы “Беларускі Хельсінкскі камітэт”, Lawtrend, Human Constanta і Dissidentby.

# ВЫСНОВЫ

- *У працэсе знішчэння структур грамадзянскай супольнасці былі два пікі: 3-і квартал 2021-га года і 3-і квартал 2022-га года. У 2-ім квартале гэтага года знікла на 5% больш арганізацый, чым цягам папярэдняга перыяду. У дадзеным кірунку рэсурсы дзеля павелічэння рэпрэсіўнага ціску блізкія да вычарпання.*
- *Інструментальнае выкарыстанне антыэкстрэмісцкага заканадаўства таксама зведала некалькі пікаў. Першы пік прыпаў на канец 2021–пачатак 2022-га гадоў, другую хвалю мы перажываем цяпер. У сёлетнім 2-ім квартале адносна папярэдняга квартала было праведзена на 2% больш судовых пасяджэнняў, было прызнана на 25% больш "экстрэмісцкіх фармаванняў", на 74% больш грамадзян было ўнесена ў "экстрэмісцкі спіс".*
- *Колькасць адвольных затрыманняў палітычных апанентаў таксама змяняецца хвалепадобна. Улады маштабна рэагуюць праз гэта на любыя раздражняльнікі, пачынаючы ад вулічных пратэстаў і заканчваючы ініцыятывамі дэмакратычных сіл. У справаздачным перыядзе пасля "электаральнай хвалі" затрыманняў, што набірала моц з сярэдзіны мінулага года, зараз (па папярэдняй інфармацыі) назіраецца невялікі спад колькасці затрыманняў.*
- *У справаздачным перыядзе ў параўнанні з папярэднім адміністратыўны ціск знізіўся на 15%. Аднак гадавая сярэднеквартальная дынаміка паказвае, што адміністратыўны пераслед апанентаў рэжыму пасля 2021-га года дэманструе ўстойлівую тэндэнцыю росту.*
- *Крымінальны пераслед беларусаў, не згодных з дзейнай уладай, таксама мае хвалевую структуру: першая хваля адзначалася ў другой палове 2021-га года, другая – у сярэдзіне 2023-га года. Цяпер, верагодна, мы знаходзімся на пачатку трэцяй хвалі, якая пачалася з першага квартала 2024-га года і цяпер выйшла на ўзровень больш за 450 крымінальных спраў за квартал. Гэта абсалютны максімум за апошнія 4 гады.*
- *Пік прызнання асуджаных палітычнымі зняволенымі ў Беларусі выпадае на канец 2021-га года, калі ў месяц такімі прызнаваліся больш за 100 чалавек. У наступныя гады інтэнсіўнасць прызнання палітвязнямі была ніжэйшай, аднак у справаздачным перыядзе колькасць "новых" палітвязняў перавысіла аналагічны паказнік мінулага квартала на 80%.*

Высунутая намі раней гіпотэза аб тым, што ў канцы мінулага года пачалася новая "рэпрэсіўная хваля", спраўджваецца – рэпрэсіўны ціск на беларускае грамадства расце. Рэжым Лукашэнкі працягвае лічыць беларускае грамадства сваім ворагам і ўзмацняе рэпрэсіі супраць тых, каго лічыць сваімі апанентамі.

# II КВАРТАЛ 2024 ГОДА НА ФОНЕ 4 ГАДОЎ РЭПРЭСІЙ

Рэпрэсіўная машына, пабудаваная рэжымам Лукашэнкі, мае шмат кампанентаў і працуе на розных узроўнях. Каб разумець дынаміку дзейнасці гэтай сістэмы, мы звяртаем увагу на два асноўныя напрамкі, для аналізу дынамікі якіх ёсць дастаткова якасных звестак. Як і ў папярэдніх выданнях "Барометра рэпрэсій" (першы, другі), гэта:

- запалохванне – захады, каб выклікаць трывогу і страх шляхам дэманстрацыі ўсёмагутнасці сілавікоў рэжыму ў Беларусі. Гэтыя дзеянні закліканыя максімальна здушыць думкі аб прэтэнзіях грамадства на свабоду і самаарганізацыю;
- затрыманні і арышты – пераслед грамадзян, якія тым ці іншым чынам выказваюць сваю нязгоду з дзяржаўнай палітыкай: выступаюць супраць фальсіфікацыі выбараў, неабмежаванага гвалту, саўдзелу Беларусі ў расейска-ўкраінскай вайне і г.д.

**Неабходны дысклэймэр:** Большасць звестак, спалучаных з колькаснымі характарыстыкамі працэсаў, варта інтэрпрэтаваць як мінімальна магчымыя паказнікі з наступных прычынаў: а) закрытасці значнай часткі дзяржаўнай статыстыкі; б) атмасферы страху, праз якую да праваабаронцаў не даходзіць частка інфармацыі пра рэпрэсіі ў краіне. Насамрэч лічбавыя характарыстыкі рэпрэсіяў у Беларусі, хутчэй за ўсё, істотна вышэйшыя.

У якасці дадатковых напрамкаў былі выдзеленыя сферы, дзе за справаздачны перыяд назіраецца дакладная дынаміка, разуменне якой неабходнае для адсочвання зменаў у крымінальна-рэпрэсіўнай сістэме. У розныя перыяды намаганні ўладаў розных рэпрэсіўных узроўняў размяркоўваюцца нераўнамерна, таму спіс дадатковых напрамкаў можа мяняцца. У дадзеным выпуску ў якасці дадатковага кірунку разглядаецца толькі адно:

- меры кантролю над грамадствам – разбурэнне сфер свабоды і самаарганізацыі, падпарадкаванне дзейнасці сацыяльных суб'ектаў інтарэсам дзяржавы на ўсіх узроўнях, ад бізнесу і трэцяга сектара да паўсядзённага жыцця.

У адрозненне ад мінулых справаздач цяпер для ілюстрацыі спецыфікі справаздачнага квартала мы прыцягваем не квалітатыўную інфармацыю, а максімальна дасяжныя колькасныя звесткі.

Па магчымасці колькасныя дадзеныя будуць апісваць увесь перыяд рэпрэсій, разгорнутых рэжымам Лукашэнкі ад пачатку электаральнай кампаніі 2020-га года.

## КАНТРОЛЬ

Нараджэнне новых арганізацый і закрыццё тых, якія выпрацавалі свой рэсурс, – нармальны працэс, які пастаянна ідзе як у грамадстве ў цэлым, так і ў асяроддзі арганізацый трэцяга сектара.

Аднак у Беларусі гэты працэс ніколі не меў такога “нармальнага” характару. Беларускай спецыфікай быў пастаянны ціск на трэці сектар і яго перманентная чыстка ад найбольш небяспечных з пункту гледжання рэжыму Аляксандра Лукашэнкі структур і ініцыятыў[1].

Пасля падзеяў 2020-га года ўлады шматкроць узмацнілі ціск на беларускую грамадзянскую супольнасць, практычна знішчыўшы яе базавую інфраструктуру. Вядома, гэта адбылося не адразу і не ў адзін дзень. Рэтраспектыўны аналіз дазваляе вылучыць два пікавыя моманты: а) 3-і квартал 2021-га года, калі былі знішчаныя (праз ліквідацыю або фактычны прымус да самаліквідацыі) мінімум 283 арганізацыі грамадзянскай супольнасці; б) 3-і квартал 2022-га года, цягам якога было ліквідавана (або змушана да самаліквідацыі) як мінімум 229 арганізацый[2].

**Пакватальная колькасць арганізацый трэцяга сектара, (сама)ліквідаваных з канца 2020 года**
(па звестках Lawtrend)




1 Ад 2000-га года Індэкс устойлівасці АГС (CSO Sustainability Index) ніколі не перавышаў 5 балаў (1 бал – найлепшае становішча, 7 – найгоршае становішча). “Поле не выпалена”.

2 “...Рашэнне аб самаліквідацыі прымаецца перш за ўсё з-за ціску на чальцоў, супрацоўнікаў НКА, неспрыяльнага прававога асяроддзя, агульнай грамадска-палітычнай сітуацыі ў краіне”. Маніторынг сітуацыі са свабодай асацыяцый.

Важна адзначыць, што хоць пік 2022-га года быў ніжэйшы за рэкорд папярэдняга года, у гадавой суме найбольшыя страты беларускі трэці сектар пацярпеў усё ж у 2022-ім годзе. Тады ў сярэднім за квартал знішчалася каля 165-170 арганізацый.

У цэлым жа за перыяд ад пачатку 2021-га года да чэрвеня 2024-га года ўключна ў Беларусі было ліквідавана больш за 1700 арганізацый трэцяга сектара. Паводле некаторых ацэнак[3], гэта можа складаць палову і нават больш ад усіх інстытуцыялізаваных структур грамадзянскай супольнасці.




** Для звестак: тут і далей даныя з 2024-га года даюцца па першых двух кварталах.*

Абапіраючыся на дадзеныя рэтраспектыўнага аналізу, мы можам казаць яшчэ пра адну тэндэнцыю: у межах аднаго года пікавыя значэнні паводле колькасці ліквідаваных арганізацый трэцяга сектара на працягу апошніх трох гадоў выпадаюць на трэці квартал.

На дадзены момант звесткі з 2024-га года ўпісваюцца ў гэтую тэндэнцыю.

Другі квартал запар мы назіраем рост колькасці ліквідаваных НКА/НДА. Калі цягам першага квартала былі закрытыя 92 арганізацыі, то ў другім – 97. Пакуль гэта крыху ніжэй за сярэднія квартальныя паказнікі цягам апошніх 4 гадоў (118 арганізацый). Але калі тэндэнцыя, якая працавала папярэднія тры гады, захаваецца, то ў трэцім квартале мы цалкам можам убачыць лічбы, якія будуць перавышаць 100 знішчаных арганізацый за квартал і будуць набліжацца да сярэдніх паказнікаў, у якія ўлічаны нават пік рэпрэсій супраць НКА ў 2022-ім годзе.

3 “Половина уничтожена”. Что с гражданским обществом Беларуси?

**Штомесячная колькасць арганізацый трэцяга сектара, (сама)ліквідаваных за апошнія 12 месяцаў**
(па звестках Lawtrend)




## ЗАПАЛОХВАННЕ: ЭКСТРЭМІЗМ І ТЭРАРЫЗМ

Інструментальнае выкарыстанне заканадаўства для ціску як на актывістаў, так і на структуры грамадзянскай супольнасці заўсёды было яшчэ адной візітоўкай рэжыму Аляксандра Лукашэнкі. Пасля 2020-га года ў гэтым рэчышчы асаблівае месца належыць антыэкстрэмісцкаму раздзелу беларускага заканадаўства якое было яшчэ больш “аптымізавана” рэжымам дзеля сваіх мэтаў у 2021-ым годзе.

У справаздачы юрыдычныя асаблівасці развіцця гэтай галіны беларускай юрыспрудэнцыі не разглядаюцца[4]. Мы канцэнтруемся выключна на колькасных паказніках яе прымянення паводле некалькіх пазіцыяў: а) прызнанне інфармацыі экстрэмісцкімі матэрыяламі; б) прызнанне экстрэмісцкімі фармаваннямі арганізацый і супольнасцяў; в) прызнанне грамадзян экстрэмістамі; г) прызнанне грамадзян тэрарыстамі.

### Экстрэмісцкія матэрыялы

Весці спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў улады Беларусі пачалі яшчэ ў 2008-ым годзе.

4 У гэтых пытаннях глядзі, напрыклад, Беларускі Хельсінкскі камітэт: Агляды правоў чалавека ў Беларусі: асноўныя трэнды дзяржаўнай палітыкі.

**Колькасць судовых пасяджэнняў па прызнанні чагосьці экстрэмісцкімі матэрыяламі**
(паводле звестак афіцыйных спісаў Міністэрства інфармацыі)




Першапачаткова папаўненне спісу экстрэмісцкіх матэрыялаў вялося спарадычна. У гэтым профілі цягам года праводзіліся 1-2 судовыя пасяджэнні. Пасля ўкраінскіх падзей 2014-га года колькасць судовых пасяджэнняў павялічылася з пікам у 2018-ым годзе, пасля пачала спадаць і ў 2020-ым годзе дасягнула свайго пяцігадовага мінімуму.

Галоўнымі матэрыяламі, якія да 2020-га прызнаваліся экстрэмісцкімі, былі крыніцы, звязаныя з правай ідэалогіяй, нацызмам/расізмам ці персонай Адольфа Гітлера. На другім месцы былі матэрыялы анархісцкага характару[5].

У 2021-ым годзе сітуацыя радыкальна змянілася. Цягам года ў кожным наступным квартале колькасць судоў, якія прызнавалі тыя ці іншыя матэрыялы экстрэмісцкімі, практычна падвойвалася.

5 “Тэлеграм” перастаў быць галоўнай сацсеткай экстрэмістаў?

**Паквартальная дынаміка колькасці судоў па прызнанні інфармацыйных матэрыялаў экстрэмісцкімі з 2020 года**

(паводле звестак афіцыйных спісаў Міністэрства інфармацыі)




Як мы бачым на малюнку, першы пік пасяджэнняў па прызнанні матэрыялаў экстрэмісцкімі выпаў на канец 2021–пачатак 2022-га гадоў, калі штоквартальна праходзіла больш як па 200 такіх працэсаў.

У сярэдзіне 2022-га адбылося зніжэнне колькасці такіх судоў. Аднак ужо ў канцы таго года намеціўся іншы трэнд: паступовы рост колькасці судоў па прызнанні матэрыялаў экстрэмісцкімі. Гэты трэнд адбіваўся і ў справаздачным перыядзе, што прывяло да двухразовага перавышэння сярэднеквартальных значэнняў за апошнія 4,5 года. Так, сярэдняе значэнне за папярэднія кварталы складае 170 пасяджэнняў, а цягам першых двух кварталаў 2024-га года праводзілася ў сярэднім 348 пасяджэнняў.

Адзначым, што толькі сёлета ў красавіку было праведзена 170 такіх пасяджэнняў. Гэта з’яўляецца абсалютным рэкордам за ўвесь час функцыянавання “Рэспубліканскага спіса экстрэмісцкіх матэрыялаў”.

**Пагадовая дынаміка сярэднеквартальных паказнікаў колькасці судоў па прызнанні інфармацыйных матэрыялаў экстрэмісцкімі з 2020 года**
(паводле звестак афіцыйных спісаў Міністэрства інфармацыі)




**Штомесячная колькасць судоў па прызнанні інфармацыйных матэрыялаў экстрэмісцкімі за апошнія 12 месяцаў**
(паводле звестак афіцыйных спісаў Міністэрства інфармацыі)



Калі казаць пра колькасць пазіцый, унесеных судамі ў спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў, то на канец чэрвеня 2024-га года ў гэтым спісе налічвалася каля 4300 пазіцый. Дакладную іх колькасць назваць праблематычна, бо нярэдка здараліся сітуацыі, калі адзін і той жа матэрыял прызнаваўся экстрэмісцкім некалькі разоў рознымі судамі ў розны час.

Дынаміка колькасці пазіцый у спісе экстрэмісцкіх матэрыялаў у цэлым заканамерна супадае з дынамікай судоў па прызнанні матэрыялаў экстрэмісцкімі:

- першы пік – пачатак 2022-га года;
- з канца 2022-га года ідзе рост колькасці матэрыялаў, прызнаных экстрэмісцкімі;
- у 2024-ым годзе практычна ўдвая перавышаны сярэднегадавыя паказнікі за апошнія 4,5 года.

Зрэшты ёсць і адрозненне. Яно датычыць прагнозу дынамікі гэтага паказніка. Імаверна, у будучыні ён пачне зніжацца. Прычына гэтага крыецца ў вычарпальнасці рэсурсу: практычна ўсё, што ў той ці іншай ступені тычылася незалежных беларускіх медыяў, “прапратэсных” арганізацый і ініцыятыў, палітычных рухаў і дыяспаральных суполак ужо мае статус “экстрэмісцкіх арганізацый”. Таму цяпер тут справа ўжо даходзіць да абсурду, калі экстрэмісцкімі прызнаюцца інтэрнэт-рэсурсы гумарыстычнага характару, музычныя ці далёкія ад палітыкі адукацыйныя рэсурсы. І доля такіх матэрыялаў у апошні час толькі павялічваецца.

**Паквартальная дынаміка колькасці пазіцый, унесеных у "Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў" з 2020 года**
(паводле звестак афіцыйных спісаў Міністэрства інфармацыі)



**Пагадовая дынаміка сярэднеквартальных паказнікаў колькасці пазіцый, унесеных у "Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў" з 2020 года**
(паводле звестак афіцыйных спісаў Міністэрства інфармацыі)




**Штомесячная колькасць пазіцый, унесеных у "Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў" за апошнія 12 месяцаў**
(паводле звестак афіцыйных спісаў Міністэрства інфармацыі)



### Экстрэмісцкія фармаванні

Як адмысловы феномен “экстрэмісцкія фармаванні” з’явіліся ў Беларусі ў 2021-ым годзе ў выніку новай рэдакцыі Закона “Аб супрацьдзеянні экстрэмізму”, арыентаванай на пераслед любога іншадумства ў краіне. За любую супрацу з арганізацыямі або ініцыятывамі, унесенымі ў пералік экстрэмісцкіх (напрыклад, за інтэрв’ю медыям), можа пагражаць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі да 10 гадоў. Важна, што дзеянне гэтага закона мае зваротную сілу. Гэта значыць, улады могуць рэпрэсаваць чалавека за супрацу з “экстрэмісцкім фармаваннем” у той перыяд, калі яно такім яшчэ не з’яўлялася. І апраўдальных выракаў у такіх справах суды не выносяць.

Надзяляць арганізацыі статусам “экстрэмісцкіх фармаванняў” рэжым Аляксандра Лукашэнкі пачаў у верасні 2021-га года. І практычна адразу ж, у наступным квартале, экстрэмісцкімі фармаваннямі была прызнаная рэкордная колькасць арганізацый – 26. Пасля гэтага цягам 2022-га года адзначаецца паступовы спад актыўнасці ў гэтым рэпрэсіўным трэку, а ў 2023-ім годзе фармуецца своеасаблівая норма ў 15-16 новых экстрэмісцкіх фармаванняў штомесяц.

**Паквартальная колькасць структур, прызнаных экстрэмісцкімі фармаваннямі з верасня 2021 года**
(паводле звестак афіцыйных спісаў МУС)




Гэтая норма была парушана ў 2024-ым годзе, калі на працягу 2-х кварталаў запар колькасць новых экстрэмісцкіх фармаванняў толькі ўзрастала і ў другім квартале склала ўжо 30 арганізацый/ініцыятыў.

**Штомесячная колькасць структур, прызнаных экстрэмісцкімі фармаваннямі за апошнія 12 месяцаў**
(паводле звестак афіцыйных спісаў МУС)




Гэта больш за сярэднеквартальны паказнік апошніх 3,5 года (ён складае 19 новых статусаў "экстрэмісцкіх фармаванняў"), і нават больш за стартавы рэкорд 2021-га года.

**Пагадовая дынаміка сярэднеквартальных паказнікаў колькасці структур, прызнаных экстрэмісцкімі фармаваннямі з верасня 2021 года**
(паводле звестак афіцыйных спісаў МУС)



### Унясенне грамадзян у экстрэмісцкі спіс

Апошні “экстрэмісцкі” пункт датычыцца прызнання экстрэмістамі простых грамадзян. Гэты працэс пачаўся ў сакавіку 2022-га года. Пік унясення грамадзян у экстрэмісцкі спіс прыпаў на апошні квартал 2022-га года, калі такі статус атрымалі больш за 1500 чалавек.




У наступным 2023-ім годзе інтэнсіўнасць дзеянняў рэжыму на гэтым трэку значна знізілася, што шмат у чым паўтарала сітуацыю з прызнаннем розных незалежных структур экстрэмісцкімі фармаваннямі.

Але зноў жа, як і ў выпадку з экстрэмісцкімі фармаваннямі, у справаздачным перыядзе мы назіраем усплёск актыўнасці ў гэтым напрамку: у маі 2024-га года спіс экстрэмістаў папоўніўся на 222 чалавекі, што з’яўляецца рэкордам цягам апошніх 1,5 года. Відавочна, тут мы маем справу са своеасаблівай рэакцыяй рэжыму Лукашэнкі на выбары ў Каардынацыйную раду трэцяга склікання – адну з флагманскіх ініцыятыў беларускага дэмакратычнага руху за апошні час.

Калі казаць пра перспектывы гэтага трэка, то, улічваючы рэактыўны характар развіцця сітуацыі менавіта ў гэтым напрамку, тут у будучыні мы можам чакаць некаторага зніжэння інтэнсіўнасці ў высілках уладаў. Верагодна, гэта будзе трываць да наступных праяваў актыўнасці дэмакратычных сіл, на якія ўлады адкажуць новым вітком у папаўненні экстрэмісцкіх спісаў.

**Штомесячная колькасць людзей, унесеных у "спіс экстрэмістаў" за апошнія 12 месяцаў**
(паводле звестак афіцыйных спісаў МУС)




**Пагадовая дынаміка сярэднеквартальных паказнікаў колькасці людзей, унесеных у "спіс экстрэмістаў" з сакавіка 2022 года**
(паводле звестак афіцыйных спісаў МУС)



### Унясенне грамадзян у тэрарыстычны спіс

Падрабязна прааналізаваць дынаміку ўключэння грамадзян у “спіс тэрарыстаў”, падобна да таго, як мы гэта рабілі з іншымі паказнікамі рэпрэсій, на жаль, не з’яўляецца магчымым.

Па-першае, спецыфіка падачы інфармацыі ў спісе, дзе адсутнічаюць даты ўнясення ў яго канкрэтнага чалавека, выключае магчымасць дэталёвага аналізу. Па-другое, пасля ўзлому інтэрнэт-рэсурсаў КДБ  кіберпартызанамі інфармацыя аб унясенні грамадзян у “тэрарыстычны спіс” не з’яўлялася ў адкрытым доступе цягам некалькіх месяцаў – ад лютага да чэрвеня 2024-га года.

Дзякуючы абнаўленню гэтага спіса ад 28-га чэрвеня мы ведаем, што за апошнія 4 месяцы з лішкам у “спіс тэрарыстаў” былі ўключаныя 35 грамадзянаў Беларусі. Але ў якi канкрэтна месяц на колькі чалавек гэты спіс папоўніўся – устанавіць немагчыма. Таму канстатуем: на сёння “тэрарыстычны спіс” налічвае 1187 чалавек, з якіх 447 (38%) з’яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь.

## ЗАТРЫМАННІ: РЭПРЭСІЎНЫ МАКСІМУМ

### Уласна затрыманні

Адвольныя затрыманні палітычных апанентаў – яшчэ адна класічная практыка рэжыму Аляксандра Лукашэнкі.

У папярэднія гады маштабныя затрыманні звычайна пачыналіся ў паслявыбарчы перыяд. У 2020-ым годзе гэтая традыцыя была парушаная, масавыя затрыманні пачаліся яшчэ да выбараў – у другім квартале 2020-га года былі затрыманыя каля 600 чалавек. Але пік затрыманняў, безумоўна, прыпаў на дні прэзідэнцкіх выбараў, калі адвольна затрымліваліся тысячы людзей.

Паводле самых прыблізных падлікаў, на працягу трэцяга квартала 2020-га года былі затрыманыя больш за 20 000 чалавек – гэта з улікам як перыяду 9-12 жніўня, так і наступных нядзельных маршаў.

Актыўная пратэсная дзейнасць працягвалася да канца года. У той час сілавікі рэжыму затрымлівалі сотні і тысячы чалавек за дзень, у прыватнасці падчас маршаў пратэсту.

Апошні ўсплёск такіх масавых затрыманняў быў у першым квартале 2021-га года, калі былі затрыманыя як мінімум 2523 чалавекі. У далейшым заўважаецца пэўнае зніжэнне колькасці затрыманых, аж да канца года.

У першым квартале 2022-га года мы бачым чарговы ўсплёск колькасці затрыманняў, звязаны з пратэстам беларусаў супраць развязання Расеяй поўнамаштабнай вайны ва Украіне – былі затрыманыя мінімум 1777 чалавек.

У другім квартале 2022-га года назіраецца больш чым двухразовае зніжэнне колькасці затрыманых, аднак ужо з трэцяга квартала пачынаецца новы рост колькасці затрыманняў, які працягваецца наступныя чатыры кварталы і дасягае піка ў другім квартале 2023-га года (затрыманні ў сувязі з падрывам расейскага самалёта на аэрадроме ў Мачулішчах).

**Пакватальная дынаміка колькасці чалавек, затрыманых па палітычных матывах з першага квартала 2021 года**
(паводле звестак ПЦ «Вясна»)




Пасля ўсплёску затрыманняў, ужо традыцыйна, адзначаецца і ў трэцім квартале 2023-га года амаль двухразовы спад рэпрэсіўнай актыўнасці, за якім, зноў жа традыцыйна, пачынаецца новы рост колькасці затрыманняў. Як мы бачым на графіках, гэты пад'ём трываў да першага квартала актуальнага года (прыгадайма справу INeedHelp).

Паводле папярэдніх дадзеных (падкрэслім, на момант напісання справаздачы дасяжнымі былі толькі папярэднія звесткі), у другім квартале былі затрыманыя мінімум 448 чалавек – 104 жанчыны і 344 мужчыны. Пералік дзеянняў, за якія рэжым затрымлівае беларусаў, дастаткова традыцыйны: дасюль гэта ўдзел у пратэстах 2020-га года, непачцівыя выразы ў адрас прадстаўнікоў беларускага рэжыму, кантакты з экстрэмісцкімі матэрыяламі і г.д.

Увогуле з пачатку прэзідэнцкай электаральнай кампаніі 2020-га года колькасць вядомых праваабаронцам затрыманняў складае каля 50 000 чалавек. Як мы пісалі ў дысклэймеры да справаздачы, у рэальнасці гэтыя лічбы будуць вышэйшыя.

## Адміністратыўны пераслед

У 2020-ым годзе пераважная большасць затрыманых падвяргалася адміністратыўнаму пераследу, які часта суправаджаўся катаваннямі і жорсткім абыходжаннем[6] (зрэшты, катаванні ў беларускіх месцах зняволення працягваюцца і да сённяшняга дня[7]).

6 Гл., напрыклад, "Московское РУВД города Минска. Пытки задержанных 9-13 августа 2020 года".

7 Гл., напрыклад, "Силовик предложил мне вскрыть череп".

У цэлым дынаміка адміністратыўнага пераследу (адміністратыўныя арышты і штрафы) супадае з дынамікай затрыманняў, з папраўкай на долю крымінальнага пераследу затрыманых.

Калі казаць пра асаблівасці справаздачнага перыяду, то варта адзначыць, што ў красавіку 2024-га года зафіксаваны адзін з месячных максімумаў па колькасці вядомых выпадкаў адміністратыўнага пераследу – 531 кейс (яшчэ адзін пік быў два месяцы перад тым, у лютым 2024-га года – 548 выпадкаў).

Калі параўноўваць сярэднеквартальныя дадзеныя цягам апошніх 4 гадоў, то выразна бачна, што цяпер мы назіраем уздым рэпрэсіўнага ціску праз адміністратыўны пераслед грамадзян. Прычым гэты ўздым ідзе ад 2021-га года, а ад 2022-га ён набірае абароты, штогод падвышаючы сярэднеквартальныя паказнікі адміністратыўнага пераследу прыкладна на 200 кейсаў.

**Штомесячная колькасць адміністрацыйных працэсаў па палітычных матывах за апошнія 12 месяцаў**
(паводле звестак ПЦ «Вясна»)



**Пагадовая дынаміка сярэднеквартальных паказнікаў колькасці адміністрацыйных працэсаў па палітычных матывах з трэцяга квартала 2020 года**
(паводле звестак ПЦ «Вясна»)




## Крымінальны пераслед

Адлік пачатку крымінальнага пераследу тых, каго затрымлівалі ў 2020-ым годзе, мы пачынаем з лістапада 2020-га года, калі крымінальныя справы сталі перадаваць у суд і з'явілася магчымасць аб'ектыўна фіксаваць іх колькасць. Пры гэтым трэба ўлічваць, што з улікам закрытага характару шматлікіх судоў па-за ўвагай праваабаронцаў можа знаходзіцца да 20% усіх такіх справаў.

**Паквартальная колькасць асуджаных паводле крымінальных артыкулаў з лістапада 2020 года**
(паводле звестак ПЦ «Вясна»)



Як вынікае з рэтраспектыўнага аналізу апошніх 4 гадоў, крымінальны пераслед беларусаў, нязгодных з дзейнымі ўладамі, развіваецца хвалепадобна:

- першая хваля – гэта другая палова 2021-га года;
- другая хваля – сярэдзіна 2023-га года.

Дадзеныя паказваюць, што другая хваля крымінальнага пераследу была большай за першую. Сярэднеквартальныя паказнікі 2023-га амаль на чвэрць перавышаюць аналагічныя лічбы і 2021-га, і 2022-га гадоў.

Калі засяродзіцца на актуальным моманце, то цяпер, імаверна, можна казаць пра ўздым наступнай – ужо трэцяй – хвалі крымінальнага пераследу праціўнікаў рэжыму Аляксандра Лукашэнкі. Гэтая хваля пачалася з першага квартала 2024-га года і цягам справаздачнага перыяду выйшла на ўзровень больш за 450 крымінальных спраў за квартал – гэта абсалютны максімум за апошнія 4 гады (месячныя максімумы прыпалі на сакавік і красавік 2024-га года).

**Пагадовая дынаміка сярэднеквартальных паказнікаў колькасці асуджаных паводле крымінальных артыкулаў з лістапада 2020 года**
(паводле звестак ПЦ «Вясна»)



**Штомесячная колькасць асуджаных паводле крымінальных артыкулаў за апошнія 12 месяцаў**
(паводле звестак ПЦ «Вясна»)




### Палітвязні

Першымі прызнанымі палітвязнямі пасля пачатку прэзідэнцкай электаральнай кампаніі сталі Сяргей Ціханоўскі і яго каманда з 6 чалавек, затрыманыя на пікеце ў Горадні 29-га траўня 2020-га года. Прызнанне іх палітвязнямі адбылося па заяве праваабаронцаў 9-га чэрвеня 2020-га года. Усяго ж у другім квартале 2020-га года палітвязнямі былі абвешчаныя 23 чалавекі.

Пасля гэтага штомесячная колькасць прызнанняў палітвязнямі супернікаў рэжыму расла ў 1,5-3 разы цягам некалькіх кварталаў і дасягнула свайго піка ў апошнім квартале 2021-га года. Тады на працягу толькі кастрычніка палітычнымі зняволенымі былі прызнаныя 127 чалавек. У наступныя гады сярэднеквартальная колькасць “новых” палітвязняў стала крыху зніжацца.

Калі паглядзець на дадзеныя справаздачнага перыяду, то можна заўважыць тут тэндэнцыю да змены трэнду на зніжэнне колькасці прызнанняў палітвязнямі. Так, калі на працягу папярэдніх трох кварталаў гэты паказнік зніжаўся ў параўнанні з папярэднім перыядам  (зніжэнне складала да 24%), то ў справаздачны перыяд ён вырас на 80%: у першым квартале колькасць новых палітвязняў складала 99 чалавек, у справаздачным перыядзе – 178 чалавек.

**Пакквартальная колькасць чалавек, прызнаных палітвязнямі з другога квартала 2020 года**
(паводле звестак ПЦ «Вясна»)




У цэлым жа колькасць палітвязняў, якія знаходзяцца ў месцах зняволення, ад апошняга квартала 2022-га года застаецца на прыкладна адным узроўні – каля 1450 чалавек.

**Штомесячная колькасць чалавек, прызнаных палітвязнямі за апошнія 12 месяцаў**
(паводле звестак ПЦ «Вясна»)



**Змены ў квартальных колькасцях асоб, прызнаных палітычнымі зняволенымі, за апошнія чатыры кварталы**
(паводле звестак ПЦ «Вясна»)




Агулам з пачатку прэзідэнцкай выбарчай кампаніі 2020-га года праваабарончая супольнасць прызнала ў Беларусі палітвязнямі 3 330 чалавек, у тым ліку 595 жанчын. З іх на канец чэрвеня 2024-га года ў турмах знаходзіліся 1 413 палітвязняў, у тым ліку 168 жанчын[8].

8 “Ситуация с правами человека в июне 2024 года”.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Каб атрымаць характарыстыку агульнай дынамікі паводле ўсіх паказнікаў, мы звялі даныя аб тэмпах росту паказнікаў за справаздачны квартал у адносінах да папярэдняга перыяду ў адну табліцу. Таксама вылічылі сярэдні ўзровень дынамікі паказнікаў па кварталах[9].

| | 23'III | 23'IV | 24'I | 24'II |
|---|---|---|---|---|
| Прызнанне палітвязнямі | -16% | -1% | -37% | 80% |
| Папаўненне “спісу экстрэмістаў” | 6% | -21% | -6% | 74% |
| Рост колькасці “экстрэмісцкіх фармаванняў” | 0% | 0% | 50% | 25% |
| Крымінальны пераслед | -5% | -16% | 10% | 9% |
| Ліквідацыя НКА/НДА | 18% | -35% | 35% | 5% |
| Суды па экстрэмісцкіх матэрыялах | -6% | 28% | 24% | 2% |
| Пазіцыі ў спісе экстрэмісцкіх фармаванняў | 35% | 12% | 8% | -12% |
| Адміністратыўны пераслед | 39% | 44% | 1% | -15% |
| Колькасць затрыманых | -45% | 23% | 13% | -55% |
| **Усярэдненае змяненне** | **3%** | **4%** | **11%** | **12%** |

На падставе атрыманай інфармацыі можна канстатаваць: высунутая намі раней гіпотэза аб тым, што ў канцы мінулага года пачалася новая “рэпрэсіўная хваля”[10], на жаль, пацвярджаецца – рэпрэсіўны ціск на беларускае грамадства расце.

Зыходзячы з гэтага, мы таксама пацвярджаем наш прагноз, які быў агучаны ў другім выпуску “Барометра”: рост ціску на беларускае грамадства будзе працягвацца (як мінімум да канца выбарчай кампаніі 2025-га года).

*У якасці пасляслоўя трэба яшчэ раз нагадаць, што практычна ўсю колькасную інфармацыю, якая змяшчаецца ў справаздачы, трэба трактаваць як мінімальна магчымыя паказнікі. У рэальнасці лічбавыя характарыстыкі рэпрэсій у Беларусі будуць істотна вышэйшымі.*

9 Звернем увагу, што ў параўнанні з папярэднімі выпускамі “Барометра рэпрэсій” выніковая табліца мае крыху падрэзаны выгляд – цяпер у ёй не ўлічваюцца дадзеныя па “тэрарыстычным” трэку (мы вышэй пісалі аб цяжкасцях працы на дадзеным кірунку) і па “хапунах”. Апошнія ў дадзеным выпуску мы не разглядаем, бо пра іх мы не валодаем звесткамі, старэйшымі за 2023 год.

10 Гл. другі выпуск “Барометра”.

# ПРА АЎТАРА



**Генадзь Коршунаў –** старшы даследчык Цэнтра новых ідэй.

Мае ступень PhD сацыялагічных навук, спецыялізуецца на аналізе грамадскай думкі. Асноўныя напрамкі даследавання: сацыяльныя структуры, працэсы і інстытуты, сацыялогія рэвалюцыі, працэсы нацыянальнага будаўніцтва, дынаміка медыяпрасторы.

*Кантакт: korshunau@newideas.center*

---

**Цэнтр новых ідэй –** даследчы інстытут, які дапамагае грамадскім і палітычным актарам пабудаваць дэмакратычную і ўстойлівую Беларусь. Мы робім гэта праз правядзенне незалежных даследаванняў, узмацненне грамадскага дыялогу і падтрымку будучых лідараў.

*www.newideas.center*

Фота: ПЦ “Вясна”